**МІНІСТЭРСТВА АДУКАЦЫІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ**
Вучэбна-метадычнае аб'яднанне па гуманітарнай адукацыі

Рэгістрацыйны № ТД-050/іcп.-тып.

**УЗГОДНЕНА**

Старшыня вучэбна-метадычнага аб'яднання па гуманітарнай адукацыі
_______ А.Г.Прахарэнка
16.02.2023

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**

Рэктар Беларускага дзяржаўнага універсітэта
_______ А.Д.Кароль
16.02.2023

**ПРАГРАМА**
**ЎСТУПНАГА ІСПЫТУ**

для абітурыентаў, якія паступаюць для атрымання агульнай вышэйшай адукацыі ў скарочаны тэрмін

**па вучэбнай дысцыпліне**
**«БЕЛАРУСКАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА»**

для спецыяльнасці
6-05-0232-01 «Беларуская філалогія»

**УЗГОДНЕНА**

Першы намеснік Міністра адукацыі Рэспублікі Беларусь
_______ А.Г.Бахановіч

2023 г.

**РЭЦЭНЗЕНТЫ:**

Установа адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава» (пратакол пасяджэння № 6 ад 20.01.2023 г.);

Установа адукацыі «Салігорскі дзяржаўны каледж» (пратакол пасяджэння Савета каледжа № 3 ад 16.01.2023 г.)

**РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:**

Навукова-метадычным саветам па філалагічных спецыяльнасцях вучэбна-метадычнага аб’яднання па гуманітарнай адукацыі
(пратакол № 6 ад 16.02.2023 г.)

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Праграма па вучэбнай дысцыпліне «Беларуская дзіцячая літаратура» прызначана для падрыхтоўкі да ўступных іспытаў абітурыентаў, якія паступаюць для атрымання агульнай вышэйшай адукацыі ў скарочаны тэрмін па спецыяльнасці 6-05-0232-01 «Беларуская філалогія».

Пералік спецыяльнасцей сярэдняй спецыяльнай адукацыі, якія адпавядаюць спецыяльнасцям адукацыйнай праграмы бакалаўрыяту ці бесперапыннай адукацыйнай праграме вышэйшай адукацыі, для атрымання вышэйшай адукацыі ў скарочаны тэрмін, вызначаюцца пастановай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь ад 01.11.2022 № 412 «Аб атрыманні вышэйшай адукацыі ў скарочаны тэрмін».

Змест праграмы суаднесены са зместам тыпавой праграмы для ўстаноў сярэдняй спецыяльнай адукацыі па беларускай дзіцячай літаратуры. Праграма грунтуецца на ўзаемасувязі прынцыпаў дэмакратызацыі і гуманізацыі, пераемнасці і даступнасці навучання, арыентуе на асэнсаванне духоўных і маральных каштоўнасцей.

Праграма ўключае творы дзіцячага фальклору і беларускай дзіцячай літаратуры, звесткі пра асноўныя тэндэнцыі развіцця беларускай дзіцячай літаратуры, звесткі творчай біяграфіі вядомых дзіцячых пісьменнікаў і паэтаў мінулага і сучаснасці, асноўныя тэарэтыка-літаратурныя паняцці.

Літаратурныя творы адабраны з улікам іх мастацкай і агульначалавечай значнасці, выхаваўчай каштоўнасці, месца ў творчасці пісьменніка і ў гісторыі беларускай дзіцячай літаратуры, актуальнасці для нашага часу. Пры гэтым улічваліся гуманістычны сэнс твораў, мастацкая своеасаблівасць, аўтарская пазіцыя.

Мэта – выявіць узровень ведаў абітурыентаў па беларускай дзіцячай літаратуры.

Задачы:

- выявіць узровень сфарміраванасці ўменняў і навыкаў аналізу твораў беларускай дзіцячай літаратуры, разумення літаратурнага працэсу і творчасці асобных пісьменнікаў;
- выявіць веданне асаблівасцей гістарычнага развіцця беларускай дзіцячай літаратуры.

Уступны іспыт праводзіцца ў пісьмовай форме.

На выкананне ўсіх заданняў адводзіцца 120 хвілін. Экзаменацыйная работа складаецца з 20 тэставых заданняў закрытага і адкрытага тыпу.

У тэставых заданнях закрытага тыпу прапануюцца гатовыя варыянты адказаў, з якіх абітурыентам неабходна абраць адзін ці некалькі правільных адказаў з прыведзенага спіса. У шэрагу заданняў абітурыентам прапануецца ўстанавіць адпаведнасць паміж элементамі двух мностваў.

У тэставых заданнях адкрытага тыпу абітурыентам прапануецца сфармуляваць і запісаць кароткі ці разгорнуты адказ.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

Спецыфіка беларускай дзіцячай літаратуры.

Беларускія пісьменнікі пра літаратуру для дзяцей (выказванні Якуба Коласа, Змітрака Бядулі, Алеся Якімовіча, Янкі Маўра, Васіля Віткі, Эдзі Агняцвет, Алены Васілевіч, Рыгора Барадуліна і іншае).

Асаблівасці гістарычнага развіцця беларускай дзіцячай літаратуры. Перыядызацыя.

Спецыфіка кніг для малодшых школьнікаў. Значэнне кніг у выхаванні дзяцей, абуджэнні цікавасці і любові да роднай мовы, культуры.

## РАЗДЗЕЛ 1. БЕЛАРУСКІ ДЗІЦЯЧЫ ФАЛЬКЛОР

Фальклор, яго асаблівасці. Спецыфіка беларускага фальклору. Вядомыя беларускія фалькларысты (Ян Чачот, Іван Насовіч, Павел Шэйн, Яфім Карскі, Рыгор Шырма, Кандрат Крапіва (К.К. Атраховіч), Ніл Гілевіч і іншае).

Значэнне фальклору ў выхаванні дзяцей. Беларускі дзіцячы фальклор: агульная характарыстыка, сувязь з народнай педагогікай. Асноўныя жанры (песні-калыханкі, пястушкі, забаўлянкі, лічылкі, дражнілкі, жартоўныя вершы).

Беларускія народныя казкі. Багацце беларускага казачнага эпасу. Класіфікацыя казак. Казкі пра жывёл, чарадзейныя, бытавыя (жанравыя прыметы). Казачныя героі. Казка і рэальнасць. Асаблівасці казачнага сюжэта, кампазіцыі; мова беларускіх народных казак, іх мастацкая дасканаласць. Выхаваўчае значэнне казак.

## РАЗДЗЕЛ 2. ЗАРАДЖЭННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ

Развіццё беларускага кнігадрукавання. Дзейнасць Францыска Скарыны (прадмова да «Псалтыра»). Вучэбныя кнігі («Катэхізіс» Сымона Буднага, «Евангелле вучыцельнае» Івана Фёдарава і Пятра Мсціслаўца, «Часоўнік» Пятра Мсціслаўца, «Азбука» Лаўрэнція Зізанія; «Буквар» 1618 г. як феномен беларускай і сусветнай культуры).

Значэнне творчасці першых беларускіх паэтаў. Францішак Багушэвіч – абаронца роднай мовы, паэт-патрыёт, гуманіст (вершы «Гора», «Калыханка», «Бог не роўна дзеле», паэма «Кепска будзе!»). Вершы Адама Гурыновіча і Янкі Лучыны, значэнне іх творчасці.

Рэвалюцыя 1905–1907 гг. і развіццё беларускай культуры.

Першыя беларускія кніжкі для дзяцей: «Беларускі лемантар» (1906), «Першае чытанне для дзетак беларусаў» (1906), «Гасцінец для малых дзяцей» (1906) Цёткі (Алаізы Пашкевіч). Улік узроставых асаблівасцей чытачоў, асаблівасці мастацкай формы твораў. Метадычныя парады ў «Беларускім лемантары».

Асветніцка-педагагічная дзейнасць Якуба Коласа. «Другое чытанне для дзяцей беларусаў» (1909). Тэматычная і жанравая разнастайнасць твораў. Алегарычнасць мовы. Эстэтычныя, педагагічныя вартасці «Другога чытання для дзяцей беларусаў». Вобразы беларускіх сялян і іх дзяцей. Паэтызацыя беларускай прыроды.

Цётка – рэдактар першага беларускага часопіса для моладзі «Лучынка».

Паэма-казка «Мушка-зелянушка і Камарык – насаты тварык» Максіма Багдановіча. Майстэрскае выкарыстанне ў творы фальклорных скарбаў. Асуджэнне гультайства. Гіпербала ў творы. Значэнне паэмы-казкі для эстэтычнага выхавання дзяцей.

Значэнне фальклору і лепшых твораў пачатку XX ст. для станаўлення беларускай дзіцячай літаратуры. Месца іх у чытанні сучасных школьнікаў.

## РАЗДЗЕЛ 3. СТАНАЎЛЕННЕ БЕЛАРУСКАЙ ДЗІЦЯЧАЙ ЛІТАРАТУРЫ Ў 20–30 ГГ. XX СТ.

Асаблівасці развіцця беларускай дзіцячай літаратуры ў 20–30-я гг. XX ст. (з’яўленне новага героя, асваенне новых тэм, жанравае ўзбагачэнне, развіццё беларускай дзіцячай перыёдыкі).

Першыя беларускія савецкія часопісы і газеты для дзяцей: «Зоркі» (1921–1922), «Беларускі піянер» (1924–1929), «Піянер Беларусі» (1929), «Іскры Ільіча» (1929–1941). Мэты выдання. Тэматыка, асноўныя раздзелы. Ідэйная накіраванасць, цесная сувязь з жыццём дзяцей, з палітычнымі падзеямі ў краіне і за мяжой.

Фальклорныя традыцыі і наватарства ў беларускай дзіцячай паэзіі 20–30-х гадоў XX ст. Высокая культура вершаў для дзяцей.

Развіццё беларускай прозы для дзяцей. З’яўленне і развіццё жанру аповесці.

Заходнебеларускі часопіс для дзяцей «Заранка» (1927–1931). Зоська Верас як арганізатар і рэдактар гэтага часопіса.

Апавяданні, пейзажныя замалёўкі і лірычныя абразкі Зоські Верас («Калядамі», «Прыйшла вясна», «Скуль узяліся ў нас бярозы і асіны», «Чараўніца»), іх эстэтычная каштоўнасць, значэнне ў пазнанні дзецьмі таямніц навакольнай прыроды, яе прыгажосці.

**Янка Купала**

Тэма дзяцінства ў паэзіі Янкі Купалы пачатку XX ст. Вобразы дзяцей-сірот. Пазіцыя паэта-гуманіста.

Увага Янкі Купалы да пытанняў развіцця беларускай літаратуры для дзяцей. Публікацыі ў дзіцячых часопісах «Зоркі», «Беларускі піянер», «Іскры Ільіча».

Сувязь вершаў Янкі Купалы для дзяцей малодшага школьнага ўзросту з традыцыямі беларускага дзіцячага фальклору. Займальнасць сюжэта, экспрэсіўнасць мовы. Мастацкае ўвасабленне народнай маралі ў вершы «Бай». Рамантычна-казачны вобраз Мароза (верш «Мароз»). Значэнне верша ў развіцці эстэтычных пачуццяў дзяцей.

Верш «Сын і маці», вобразы маці, сына. Значэнне верша ў абуджэнні ў дзяцей пачуцця нацыянальнай годнасці.

Гісторыя напісання верша «Хлопчык і лётчык». Мастацкае раскрыццё думак і імкненняў дзяцей. Папулярнасць верша. Публікацыі яго ў газеце «Правда». «Хлопчык і лётчык на вайне» як працяг верша «Хлопчык і лётчык».

Тэма моладзі ў вершах Янкі Купалы «Алеся», «Сыны». Сувязь з фальклорам.

**Якуб Колас**

Актыўны ўдзел Якуба Коласа ў стварэнні беларускай дзіцячай літаратуры. Супрацоўніцтва з першым беларускім часопісам для дзяцей «Зоркі» (апавяданні «Чоран», «Страшнае спатканне»).

Традыцыі вуснай народай творчасці ў паэме-казцы «Рак-вусач». Алегарычны сэнс казкі. Гіпербала, увасабленне ў казцы.

Пейзажныя вершы Якуба Коласа для дзяцей, багацце мастацка-выяўленчых сродкаў (вершы «Ручай», «На полі вясною»). Псіхалагічна дакладнае раскрыццё думак і настрояў дзіцяці ў вершы «На рэчцы зімою».

Сюжэт паэмы «Міхасёвы прыгоды». Вобраз дапытлівага і цікаўнага Міхася. Пазнавальнае значэнне паэмы. Хараство пейзажных малюнкаў. Меладычнасць паэтычнага радка.

Верш «Савось-распуснік». Прыёмы стварэння адмоўнага вобраза. Гумар і іронія ў вершы. Асаблівасці рытму і мовы, папулярнасць верша, выхаваўчае значэнне.

**Змітрок Бядуля –** адзін з заснавальнікаў беларускай дзіцячай літаратуры.

Апавяданні пісьменніка пачатку ХХ ст. («Малыя дрывасекі», «Пяць лыжак заціркі», «Тулягі»).

Дзейнасць Змітрака Бядулі як рэдактара часопіса «Зоркі» (1921–1922).

Змест паэмы-казкі «Мурашка Палашка». Услаўленне сілы калектыву. Алегарычнасць вобразаў і сітуацый. Гумар і сатыра ў казцы. Асаблівасці мовы, прыёмы паўтору, гукапісу. Месца паэмы-казкі «Мурашка Палашка» ў беларускай дзіцячай літаратуры.

Аповесць-казка «Сярэбраная табакерка». Фальклорныя традыцыі, казачнае і рэалістычнае ў творы. Гумар і сатыра.

**Янка Маўр** – заснавальнік новых тэм і жанраў у беларускай дзіцячай літаратуры.

Прыгодніцкія аповесці Янкі Маўра, іх мастацкая дасканаласць, наватарства. Своеасаблівасць сюжэта аповесці «Сын вады». Вобразы Манга і міс Грэт. Чалавечнасць, самаахвярнасць «дзікуна» Манга. Выразнасць сацыяльных характарыстык. Значэнне твораў Янкі Маўра пра іншыя краіны. Агульначалавечыя ідэі дабра, справядлівасці. Іх актуальнасць.

Інтэрпрэтацыя сюжэта рабінзанады ў аповесці «Палескія рабінзоны». Вобразы Віктара і Мірона. Тэма Радзімы ў аповесці. Значэнне «Палескіх рабінзонаў» у патрыятычным і экалагічным выхаванні дзяцей. Традыцыі «Палескіх рабінзонаў» у сучаснай беларускай прозе.

Праблема фарміравання асобы ў аповесці «ТВТ». Гумар у кнізе, элементы гульні. Аповесці «ТВТ» Янкі Маўра і «Цімур і яго каманда» Аркадзія Гайдара.

Асуджэнне антыгуманнай сутнасці каланіялізму, свету прагнасці, нажывы і эксплуатацыі ў апавяданнях «Слёзы Тубі», «Незвычайная прынада», «Лацароні». Вобразы дзяцей.

Псіхалагічныя навелы Янкі Маўра «Бярозавы конь», «Шчасце», «Максімка», іх праблематыка. Раскрыццё пісьменнікам душы дзіцяці, асаблівасцей дзіцячага ўспрымання. Лірызм навел.

Навукова-фантастычная аповесць «Фантамабіль прафесара Цылякоўскага». Жанр сацыяльнай утопіі.

Аўтабіяграфічная аповесць «Шлях з цемры». Значэнне эпіграфаў у раскрыцці ідэйнай сутнасці твора. Вобраз Янкі. Пазнавальна-выхаваўчае значэнне аповесці.

**Алесь Якімовіч**

Удзел Алеся Якімовіча ў выданні часопіса «Беларускі піянер».

Поспехі пісьменніка ў раскрыцці тэмы мінулага. Імкненне Алеся Якімовіча да эпізацыі падзей. Паказ лёсу беларускага сялянства (аповесці «Базылёў курган», «Адкуль ліха на свеце», «Канец сервітуту»). Выхаваўчае і пазнавальнае значэнне твораў Алеся Якімовіча пра мінулае.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў творчасці Алеся Якімовіча. Драматызм сюжэта аповесці «Смелыя людзі». Вобразы дзяцей. Апавяданні «Чарнавочка», «Аўтамат». Мастацкія прыёмы стварэння гераічных характараў.

Творы Алеся Якімовіча пра школу і школьнікаў. Увага пісьменніка да праблем грамадзянскага абавязку, выхавання волі і характару, працавітасці дзяцей (апавяданні «Слабая воля», «За адной партай», «Навічок», «Дзіўная хвароба», «Першы працадзень», «Маміна градка», «Залатыя рукі»).

Алесь Якімовіч – казачнік. Вершаваная казка «Каваль Вярнідуб». Сюжэт твора. Выкарыстанне фальклорных традыцый. Вобраз народнага асілка Вярнідуба. Дакладнасць і прыгажосць мовы. Значэнне казкі.

Апрацоўка беларускіх народных казак (зборнікі «Каток – залаты лабок», «Бацькаў дар», «З рога ўсяго многа», «Людзей слухай, а свой розум май», «Андрэй за ўсіх мудрэй»). Прынцыпы адбору тэкстаў для апрацоўкі.

Месца Алеся Якімовіча ў беларускай дзіцячай літаратуры.

## РАЗДЗЕЛ 4. БЕЛАРУСКАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА 40–60-Х ГАДОЎ ХХ СТАГОДДЗЯ

Асаблівасці развіцця літаратуры для дзяцей у 40–60-я гг. (агульны агляд).

Асаблівасці развіцця беларускай дзіцячай літаратуры ў гады Вялікай Айчыннай вайны.

Тэма Вялікай Айчыннай вайны як вядучая ў пасляваеннай беларускай дзіцячай літаратуры. Кніга пісьмаў-успамінаў дзяцей-удзельнікаў і сведкаў вайны «Ніколі не забудзем». Гісторыя стварэння, праблематыка. Унікальнасць кнігі, значэнне яе ў гісторыі беларускай літаратуры. Кніга «Піянеры-героі».

Беларуская дзіцячая літаратура пасляваеннага часу. Паглыбленне дакументалізму ў беларускай дзіцячай аповесці пра вайну.

Аповесці Івана Сяркова «Мы з Санькам у тыле ворага» і «Мы – хлопцы жывучыя». Праўдзівае адлюстраванне ў гэтых творах суровай праўды вайны. Вобразы Івана і Санькі. Псіхалагічная пераканальнасць іх учынкаў і дзеянняў, вобраз бабкі. Асаблівасці кампазіцыі твораў І. Сяркова. Элементы

прыгодніцтва. Эмацыянальная выразнасць мовы. Гумар у творах. Праблема гераізму. «Мы з Санькам – артылерысты» – трэцяя кніга з цыкла твораў.

**Міхась Лынькоў**

Увага пісьменніка да дзіцячай літаратуры.

Аповесць-казка «Пра смелага ваяку Мішку і яго слаўных таварышаў». Захапляльны сюжэт. Спалучэнне казачнага і рэальнага. Пазнавальнае і выхаваўчае значэнне твора.

«Міколка-паравоз» – выдатны твор дзіцячай літаратуры. Тэма грамадзянскай вайны і яе вырашэнне ў аповесці. Вобраз Міколкі. Праблема дзіцячага гераізму. Вобразы дарослых у аповесці – бацькі Міколкі, дзеда Астапа, Сёмкі-матроса. Гумар у творы. Дынамічнасць сюжэта. Смелае спалучэнне драматычнага і камедыйнага. Жыццесцвярджальны пафас. Папулярнасць і выхаваўчае значэнне аповесці. «Міколка-паравоз» на экране.

Тэма гераізму дзяцей у гады Вялікай Айчыннай вайны. Вобраз Міколкі (апавяданне «Васількі»).

**Янка Брыль**

Асаблівасці твораў Янкі Брыля для дзяцей малодшага школьнага ўзросту: даступнасць матэрыялу, пранікнёны лірызм, шчырасць і багацце інтанацый, псіхалагізм, вобразнасць і мілагучнасць мовы. Паэтызацыя прыроды, уменне абудзіць у дзяцей цікаўнасць і любоў да яе ў апавяданнях «Ліпа і клёнік», «Жыў-быў вожык», «Ветэрынар», «Сняжок і Волечка».

Апавяданне «Лазунок». Паэтызацыя натхнёнай працы. Значэнне твора ў прывіцці дзецям цікавасці да прафесіі рабочага, любові да працы.

Тэма апаленага вайной дзяцінства ў апавяданні Янкі Брыля «Зялёная школа». Незвычайная зялёная школа – сведчанне клопату дарослых аб дзецях. Вобраз чалавека-гуманіста, аптыміста, мужнага змагара супраць фашызму.

**Эдзі Агняцвет**

Тэма дружбы народаў у паэзіі Эдзі Агняцвет. Вершы пра Беларусь.

Гумарыстычныя вершы Эдзі Агняцвет, іх праблематыка. Асуджэнне некаторых заган дзяцей: ляноты, гультайства, несур’ёзных адносін да вучобы, сквапнасці, выхвалення («Параска і падказка», «Цыбуліна», «Як наеўся Рыгорка», «Шчодры Цішка», «На дачы ў гамаку», «Зося на кухні»). Мастацкая дасканаласць формы, выразнасць і вобразнасць мовы гумарыстычных вершаў Эдзі Агняцвет. Іх рытмічная разнастайнасць.

Значэнне творчасці Эдзі Агняцвет. Папулярнасць яе твораў.

## РАЗДЗЕЛ 5. БЕЛАРУСКАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА Ў 70–80-Я ГАДЫ XX СТАГОДДЗЯ

Асноўныя тэндэнцыі развіцця беларускай дзіцячай літаратуры ў 70–80 гады XX ст.

Антываенны пафас, паглыбленне матываў інтэрнацыянальнай еднасці ў творах Аляксея Пысіна, Уладзіміра Карызны, Артура Вольскага, Даіра Слаўковіча.

Выданне 15-томнай анталогіі твораў для дзяцей пісьменнікаў савецкіх рэспублік.

Павышаная цікавасць да родных вытокаў, да гісторыі і культуры (Уладзімір Караткевіч «Зямля пад белымі крыламі», Віталь Вольскі «Палессе», «Дзень добры, Бяроза!», Сяргей Грахоўскі «Гарачае лета»).

Аповесці пра вядомых беларускіх культурных дзеячаў і пісьменнікаў (Анатоль Клышка «Францыск Скарына, альбо Як да нас прыйшла кніга», Лідзія Арабей «Стану песняй», Сцяпан Александровіч «На шырокі прастор», Васіль Хомчанка «Пры апазнанні-затрымаць», Міхась Тычына «Вяртанне»).

Апавяданні пра Вялікую Айчынную вайну Васіля Хомчанкі, Івана Пташнікава, Лідзіі Арабей, Алены Васілевіч.

Празаічныя творы пра вучобу, захапленні школьнікаў. Паглыбленне псіхалагізму. Дарослыя і дзеці. Спробы пераадолення стэрэатыпаў у стварэнні вобразаў дзяцей (Яўген Радкевіч «Пешшу праз Галактыку», Уладзімір Юрэвіч «Нястрашны страх», Клаўдзія Каліна «Бабка Наста, дзед Адам, Петрык і каза Рагуля», Даір Слаўковіч «Хвядоскавы канікулы» і іншае). Жанр апавядання ў беларускай дзіцячай літаратуры. Тэматычная разнастайнасць апавяданняў, здабыткі і пралікі.

Плённае развіццё жанра беларускай літаратурнай казкі. Суадносіны традыцыйнага і наватарскага. (Уладзімір Ягоўдзік «Сонейка, свяці», Уладзімір Караткевіч «Кацёл з каменьчыкамі», Лідзія Арабей «Прынцэса Нехачу»). Выхаваўчае значэнне твораў. Жанр паэмы-казкі і вершаванай казкі ў беларускай дзіцячай літаратуры (Еўдакія Лось «Казка пра Ласку», Сяргей Грахоўскі «Васіль на Месяц паляціць» і іншае).

**Уладзімір Дубоўка**

Жанр вершаванай казкі ў творчасці Уладзіміра Дубоўкі. Традыцыйнае і наватарскае. Ідэі гуманізму, праблемы працоўнага выхавання, дабрыні, самаахвярнасці, іх вырашэнне ў казках «Айога», «Чые рукі прыгажэйшыя», «Як сінячок да сонца лётаў».

Адточанасць і багацце мовы казак Уладзіміра Дубоўкі, высокая культура верша, багацце фарбаў, інтанацый, уменне знайсці адпаведны тон у размове з дзецьмі.

«Жоўтая акацыя» – першы празаічны твор Уладзіміра Дубоўкі для дзяцей. Асаблівасці сюжэтнай будовы. Майстэрскае ўключэнне ў аповесць вялікага пазнавальнага матэрыялу. Значэнне твора ў абуджэнні ў дзяцей прагі да ведаў, творчага пошуку, цікавасці да прыроды.

**Максім Танк**

Тэматычнае багацце твораў Максіма Танка для дзяцей, сувязь з фальклорнымі традыцыямі.

Асаблівасці паэтыкі. Майстэрства пейзажных апісанняў. Уменне адкрыць дзецям дзіўнае, паэтычнае ў самых звычайных з’явах («Сярод лясоў наднёманскіх», «Мухамор»). Прыёмы займальнасці, актывізацыі думкі дзяцей. Чысціня мовы.

Паэма-казка Максіма Танка «Быліна пра касмічнае падарожжа Мураша Бадзіні». Займальнасць сюжэта, пазнавальнасць. Паэтызацыя мужнасці і чалавечнасці касманаўтаў. Мова твора. Традыцыйнае і наватарскае ў казцы.

Маральна-этычныя праблемы ў творах Максіма Танка. Роля і месца яго творчасці ў развіцці беларускай дзіцячай літаратуры.

**Васіль Вітка**

Адметныя асаблівасці твораў Васіля Віткі для дзяцей.

Творы з уласна аўтарскім сюжэтам («Вавёрчына гора», «Буслінае лета», «Казка пра цара Зубра», «ППШ»).

Паэма-казка «Вавёрчына гора», дынамічнасць сюжэта. Багацце інтанацыйных адценняў, значэнне паўтораў у творы. Дыялогі ў паэмах-казках Васіля Віткі, іх значэнне ў абуджэнні фантазіі ў дзяцей.

Уменне паэта арганічна ўключаць у дзіцячую кнігу пазнавальны матэрыял («Буслінае лета»).

Элементы прыгодніцтва ў паэмах-казках Васіля Віткі.

Майстэрская апрацоўка вядомых фальклорных сюжэтаў. Традыцыйнае і наватарскае ў творах паэта.

Жанравая разнастайнасць творчасці Васіля Віткі. Агульны аналіз пацешак, пястушак, песень-калыханак, жартоўных вершаў, дзіцячых гульняў.

Вершы пра родную прыроду, майстэрскае выкарыстанне гукапісу («Кнігаўка», «Салавей», «Ластаўка»).

Васіль Вітка – знаўца дзіцячай душы, тактоўны і разумны выхавальнік (кнігі «Дзеці і мы», «Урокі», «Азбука душы»).

Значэнне паэзіі Васіля Віткі для абуджэння ў дзяцей павагі да працы, спагадлівасці і добразычлівасці, цікавасці і любові да роднай прыроды, мовы, роля ў эстэтычным выхаванні дзяцей.

**Алена Васілевіч**

Тэматычная разнастайнасць твораў для дзяцей.

Казка «Калінавая рукавічка». Праблема ўзаемаадносін чалавека і прыроды. Адлюстраванне любові, беражлівых адносін чалавека да прыроды ў апавяданнях «Браты-артысты», «Геша», «Бабуліны кватаранты», «Цюлік».

Тэма барацьбы беларускіх партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны ў апавяданні «Партызанка Кніга».

Праяўленне творчай індывідуальнасці Алены Васілевіч, тонкага лірызму ў тэтралогіі «Пачакай, затрымайся». Аўтабіяграфізм твора.

**Артур Вольскі**

Школьная тэма ў паэзіі Артура Вольскага, сродкі гумару і сатыры (вершы «Чаму Рыгорка мыкаў», «Што чарнілы нарабілі», «Чаравік у Светы знік»).

Грунтоўнасць пазнання і раскрыцця духоўнага свету, асаблівасцей успрыняцця дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту. Займальнасць сюжэтаў. Паэтычнае майстэрства Артура Вольскага. Шматфарбнасць, моўнае багацце твораў.

Месца Артура Вольскага ў беларускай дзіцячай паэзіі.

# РАЗДЗЕЛ 6. БЕЛАРУСКАЯ ДЗІЦЯЧАЯ ЛІТАРАТУРА НА СУЧАСНЫМ ЭТАПЕ

Асаблівасці развіцця беларускай дзіцячай літаратуры на сучасным этапе. Агульныя тэндэнцыі развіцця беларускай дзіцячай літаратуры на сучасным этапе. Жанравая і тэматычная разнастайнасць эпічных твораў для дзяцей.

Навукова-папулярныя творы пра даўнюю беларускую гісторыю (Сяргей Тарасаў, Вітаўт Чаропка і іншае). Гістарычнае мінулае нашай краіны, культурныя асаблівасці яе жыхароў (серыя літаратурна-мастацкіх выданняў пад назвай «Сем цудаў Беларусі» («Сем цудаў Беларусі» Уладзіміра Ягоўдзіка, «Славутыя родам сваім», «Адвечны покліч Радзімы», «Званы Нямігі» Анатоля Бутэвіча).

Маральна-этычная праблематыка ў сучаснай прозе (Іван Навуменка «Год карася», Лідзія Арабей «Мікітаў сон», «Дагары нагамі», «Васільковы бант»).

Тэма школьнага жыцця (аповесць Валерыя Гапеева «Пастка на рыцара»).

Творы этнаграфічнага і краязнаўчага, прыродазнаўчага зместу (Яраслаў Пархута «Зямля бацькоў нашых», «Падарожжа па родным краі», Леанід Чумакоў «Насякомыя: Шасціногія суседзі», Ядвіга Шапарава «Грыбы: Вялікая таямніца прыроды»).

Праблемы выхавання экалагічнай культуры (апавяданні Эдуарда Луканскага «Госць з Чырвонай кнігі», «Зорачка», Даіра Слаўковіча «Навошта ружы калючкі», Андрэя Федарэнкі «Ратан», Васіля Макарэвіча «Вясёлыя скокі», Васіля Гурскага «Лясная сімфонія», «Пчолы і трутні»).

Інтэлектуальная скіраванасць, увага да самастойнага набыцця ведаў (Васіль Вітка «Урокі думкі», апавяданні Змітрака Марозава са зборніка «Азбука агранома Валошкі», аповесць Міколы Чарняўскага «Акадэмія на колах, альбо За вясёлкай наўздагон»).

Навукова-фантастычная і прыгодніцкая літаратура (Андрэй Федарэнка «Афганская шкатулка», Аляксей Якімовіч «Эльдарада просіць дапамогі», «Сакрэт Тунгускага метэарыта», «Прыгоды шасцікласніка Максіма»).

Развіццё жанру літаратурнай казкі (Андрэй Федарэнка «Мужыкі і пан», Мікола Гайдук «Белавежскія быліцы і небыліцы», Раіса Баравікова «Пра майстра Дзве Залачоныя дужкі», Ніна Мацяш «Залатое Сэрца», Васіль Шырко «Дзед Манюкін не салжэ», «Дзед Манюкін і ўнукі», Алесь Савіцкі «Радасці і нягоды залацістага карасіка Бубліка», фэнтэзі Раісы Баравіковай «Дзве аповесці пра міжпланетнага пажарніка»).

Жанравая і тэматычная разнастайнасць сучаснай паэзіі для дзяцей (Кастусь Цвірка, Казімір Камейша, Галіна Каржанеўская, Валянцін Лукша, Іван Муравейка, Леанід Пранчак і іншае).

Пазнавальнае значэнне загадкі (Уладзімір Мацвеенка «Загадкі Зайкі-Загадайкі», «Азбука ў загадках», «Загаданачка»; Міхась Пазнякоў «Ехаў поўны воз дзівос», «Дарынка-весялінка»).

Займальныя азбукі (Рыгор Барадулін «Азбука не забаўка», «Азбука – вясёлы вулей», Авяр'ян Дзеружынскі «Жывая азбука»; Максім Танк «Лемантар» і іншае).

Фальклорны рэнесанс у беларускай драматургіі для дзяцей (Пятро Васючэнка «Новы калабок», Сяргей Кавалёў «Хохлік», Людміла Рублеўская «Янук, рыцар Мятлушкі»).

Матыў падарожжа і прыгод (Уладзімір Сіўчыкаў «Філасофскі камень», Уладзімір Граўцоў «Прыгоды Міхея і Марціна»).

Наватарства ў дзіцячай драматургіі: выкарыстанне элементаў трылера (Міраслаў Адамчык, Максім Махнач «У чорным-чорным горадзе…»), выкарыстанне элементаў фэнтэзі і навуковай фантастыкі (Зінаіда Дудзюк «Канікулы на астэроідзе», Галіна Багданава «Рамантычнае падарожжа на той свет» і іншае).

**Павел Місько**

Жанравая разнастайнасць твораў Паўла Місько для дзяцей. Творы для сярэдняга і старэйшага школьнага ўзросту – «Зямля ў нас такая», «Грот афаліны». Элементы прыгодніцтва. Вобразы дзяцей.

Малодшыя школьнікі – галоўныя героі аповесці «Навасёлы, або Праўдзівая, часам вясёлая, часам страшнаватая кніга пра незвычайны месяц у жыцці Жэні Мурашкі». Вобраз Жэні Мурашкі і яго сяброў. Пераканальнасць дзіцячых характараў, займальнасць і павучальнасць сюжэта. Вобразы дарослых. Незвычайнае і звычайнае ў творы. Дасканалы гумар, прыгоды. Праблемы школьнага навучання, выхавання. Педагагічная канцэпцыя аўтара, мова кнігі. Багацце і яркасць дыялогаў.

Арыгінальная аповесць Паўла Місько «Прыгоды Бульбобаў». Задума твора. Сюжэт. Прыём антрапамарфізму. Дзіцячыя вобразы. Нестандартнасць сітуацый і ўчынкаў дзяцей. Лірызм аповесці, яе гуманістычная сутнасць. Дасканалы гумар, сцэнічная выразнасць эпізодаў. Мова кнігі. Прыхаваная лагодная ўсмешка аўтара.

Фантастычная аповесць Паўла Місько для малодшых школьнікаў «Эрпіды на планеце Зямля». Фантастычнае і рэальнае ў творы. Займальнасць сюжэта. Вобраз Вані Гардзея. Эрпіды і людзі. Канфліктныя сітуацыі. Праблемы сяброўства, чалавечых узаемаадносін, фарміравання асобы. Гумар як характэрная асаблівасць аўтарскага голасу. Навуковыя звесткі ў кнізе.

Наватарства Паўла Місько як дзіцячага пісьменніка. Узбагачэнне жанраў аповесці, апавядання.

**Рыгор Барадулін**

Жанравая разнастайнасць дзіцячай паэзіі Рыгора Барадуліна. Тонкае адчуванне ўзроставых асаблівасцей дзяцей. Фальклорныя традыцыі, наватарскія пошукі. Нацыянальная адметнасць твораў Рыгора Барадуліна. Яркая метафарычнасць, багацце, вобразнасць мовы. Сцэнічнасць сюжэта.

Вершы-загадкі, заданні, задачкі. Кантакт аўтара з дзецьмі. Пытальныя сказы ў назвах і змесце твораў Рыгора Барадуліна («Ты чуў? Ты чула?», «Ты не верыш?»).

Вобразы дзяцей у паэзіі Рыгора Барадуліна. Адсутнасць вывадаў-павучанняў, знарочыстай дыдактычнасці. Шляхі дасягнення выхаваўчага эфекту. Слова-вобраз як асноўны стымул актывізацыі фантазіі, уяўлення, розуму дзяцей. Сучасны змест. Эстэтычная дасканаласць вершаў, іх рытмічная

разнастайнасць, выразнасць. Ускладненасць мовы некаторых вершаў («Індыкала-кудыкала», «Кобра ў торбе»).

Эстэтычная каштоўнасць паэзіі Рыгора Барадуліна для дзяцей, яе роля ў абуджэнні цікавасці да роднага слова, выхаванне ў дзяцей назіральнасці, моўнай чуйнасці, пачуцця прыгожага, станоўчых маральных якасцей.

**Уладзімір Ліпскі** як рэдактар часопіса «Вясёлка».

Кнігі Уладзіміра Ліпскага для дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту («Рыгоркавы прыгоды», «Марынчына казка» і іншае). Выхаванне ў дзяцей дабрыні. Развіццё патрабавальнасці да сваіх учынкаў, пачуцця гумару, творчых здольнасцей дзіцяці.

Праблемы сям’і і дзяцінства ў кнігах «Падкідыш», «Бацькі і дзеці».

Прызнанне ў любові і павазе да бацькоў (кнігі «Мама. Малітва сына», «Бацька. Пісьмы сына»).

Мастацкія асаблівасці кнігі «Я. Праўдзівы аповед пра твой і мой радавод».

## РАЗДЗЕЛ 7. СУЧАСНЫЯ ПЕРЫЯДЫЧНЫЯ ВЫДАННІ ДЛЯ МАЛОДШЫХ ШКОЛЬНІКАЎ

Часопісы «Бярозка», «Вясёлка», «Лесавік», газета «Раніца» – сучасныя перыядычныя выданні для малодшых школьнікаў.

Гісторыя выдання штомесячнага дзіцячага часопіса «Бярозка». Займальнасць, надзённасць, выхаваўчы змест матэрыялаў часопіса.

Папулярнасць дзіцячага часопіса «Вясёлка» (рэдактар Уладзімір Ліпскі). Структурны падзел і зместавае напаўненне кожнай рубрыкі часопіса. Высокі мастацкі ўзровень твораў, наяўнасць агульнага персанажа часопіса Васі Вясёлкіна. Чытанка-маляванка «Буся» для дашкольнікаў.

Фотачасопіс «Лесавік» – экалагічнае выданне для сям’і і школы. Заснавальнік і выдавец Уладзімір Ягоўдзік. Адрозненне ад іншых выданняў. Прэзентацыя новых беларускамоўных кніг пра прыроду ў рубрыцы «Леснічоўка».

Публікацыя матэрыялаў па праблемах выхавання дзяцей і мастацкіх твораў у часопісах «Пачатковая школа», «Пралеска», «Роднае слова», «Адукацыя і выхаванне», «Бібліятэка прапануе», «Пачатковае навучанне».

# СПІС РЭКАМЕНДАВАНАЙ ЛІТАРАТУРЫ

1. Беларуская дзіцячая літаратура: вучэб. дапам. / пад рэд. А.М. Макарэвіча, М.Б. Яфімавай. – Мінск, 2008.

2. Беларуская дзіцячая літаратура: хрэстаматыя / склад. М.Б. Яфімава, В.М. Ляшук. – Мінск, 2003.

3. Беларуская дзіцячая літаратура: хрэстаматыя / аўт.-уклад. М.Ф. Шаўлоўская. – Мінск, 2006.

4. Беларуская дзіцячая літаратура: хрэстаматыя крытычных матэрыялаў: вучэб. дапам. / склад. В.А. Лашкевіч, Р.К. Літвінаў. – Мінск, 1981.

5. Макарэвіч, А.М. Беларуская дзіцячая літаратура ў тэрмінах і паняццях: дапам. / А.М. Макарэвіч, В.І. Караткевіч; пад агул. рэд. А.М. Макарэвіча. – Магілёў, 2014.

6. Марціновіч, А.А. Святло чароўнага ліхтарыка: выбран. старонкі гісторыі белар. дзіцяч. літаратуры: дапам. для педагогаў дашк. устаноў / А.А. Марціновіч. – Мінск, 1998.

7. Несцяровіч, В.Б. Беларуская дзіцячая літаратура / В.Б. Несцяровіч, М.Ф. Шаўлоўская. – Мінск, 2008.

8. Трафімчык, А.В. Беларуская дзіцячая драматургія / А.В. Трафімчык. – Мінск, 2012.

9. Шаўлоўская, М.Ф. Дыдактычны матэрыял па беларускай дзіцячай літаратуры : вучэб.-метад. дапам. / М.Ф. Шаўлоўская. – Мінск, 2005.

10. Яфімава, М.Б. Слова – краска, слова – ззянне… : дапам. / М.Б. Яфімава. – Мінск, 2000.

## КРЫТЭРЫІ АЦЭНКІ ЎСТУПНАГА ІСПЫТУ

За кожны дакладны адказ пры выкананні закрытых заданняў удзельнік іспыту атрымлівае 1 бал. Заданні з кароткім адказам ацэньваюцца 2–5 баламі. Ацэнка выканання заданняў, якія патрабуюць напісання разгорнутага адказу, адбываецца па 3 крытэрыях: 1) адпаведнасць адказу заданню, 2) выкарыстанне прыкладаў для аргументацыі, 3) лагічнасць і захаванне маўленчых нормаў.

За заданні, якія патрабуюць разгорнутага адказу, можна атрымаць 15 балаў (па кожным крытэрыі – максімальна 5 балаў).

Крытэрыі ацэнкі ведаў абітурыентаў па беларускай дзіцячай літаратуры:

| Адзнака ў балах | Паказчыкі ацэнкі |
|---|---|
| 1 (адзін) | Пазнаванне асобных аб’ектаў вывучэння праграмнага вучэбнага матэрыялу, якія прад’яўляюцца ў гатовым выглядзе (фактаў, тэрмінаў і іншае). |
| 2 (два) | Распазнаванне аб’ектаў вывучэння праграмнага вучэбнага матэрыялу, якія прад’яўляюцца ў гатовым выглядзе (фактаў, з’яў беларускай дзіцячай літаратуры і іншае). |
| 3 (тры) | Узнаўленне часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу па памяці (фрагментарны пераказ і пералічэнне з’яў беларускай дзіцячай літаратуры і іншае). |
| 4 (чатыры) | Узнаўленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (апісанне з элементамі тлумачэння перыядаў развіцця беларускай дзіцячай літаратуры, некаторых фактаў жыцця і творчасці пісьменнікаў і іншае); выкарыстанне ведаў у знаёмай сітуацыі па ўзоры (аналіз асобных элементаў мастацкага твора і іншае); наяўнасць адзінкавых істотных памылак. |
| 5 (пяць) | Усвядомленае ўзнаўленне большай часткі праграмнага вучэбнага матэрыялу (апісанне перыядаў развіцця беларускай дзіцячай літаратуры, найбольш важных фрагментаў жыцця і творчасці пісьменнікаў розных перыядаў з тлумачэннем адрознівальных асаблівасцей творчай манеры і іншае); выкарыстанне ведаў у знаёмай сітуацыі па ўзоры (аналіз асобных элементаў мастацкага твора і іншае); наяўнасць неістотных памылак. |
| 6 (шэсць) | Поўнае веданне і ўсвядомленае ўзнаўленне ўсяго праграмнага вучэбнага матэрыялу; валоданне праграмным вучэбным матэрыялам у знаёмай сітуацыі (апісанне і тлумачэнне перыядаў развіцця беларускай дзіцячай літаратуры, жыццёвага і творчага шляху пісьменнікаў розных перыядаў, выяўленне і абгрунтаванне асаблівасцей іх творчай манеры і іншае); выкарыстанне заданняў па ўзоры (аналіз мастацкага твора і іншае); наяўнасць неістотных памылак. |

| Адзнака ў балах | Паказчыкі ацэнкі |
|---|---|
| 7 (сем) | Поўнае, трывалае веданне і ўзнаўленне праграмнага вучэбнага матэрыялу; валоданне праграмным вучэбным матэрыялам у знаёмай сітуацыі (разгорнутае апісанне і тлумачэнне развіцця беларускай дзіцячай літаратуры ў розныя перыяды, найбольш важных фактаў жыцця і творчасці пісьменнікаў; раскрыццё творчай манеры пісьменнікаў; абгрунтаванне і доказ яе сутнасці; фармуляванне вывадаў аб заканамернасцях развіцця беларускай дзіцячай літаратуры і іншае); недастаткова самастойнае выкананне заданняў (аналіз мастацкіх твораў, ідэі, задумы і іншае); наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |
| 8 (восем) | Поўнае, трывалае, глыбокае веданне і ўзнаўленне праграмнага вучэбнага матэрыялу; аперыраванне праграмным вучэбным матэрыялам у знаёмай сітуацыі (разгорнутае апісанне і тлумачэнне заканамернасцей развіцця беларускай дзіцячай літаратуры, жыцця і творчасці пісьменнікаў, раскрыццё сутнасці літаратурных прыёмаў і метадаў, якія выкарыстоўваюць пісьменнікі; абгрунтаванне і доказ асаблівасцей іх творчай манеры, фармуляванне вывадаў аб значэнні творчасці найбольш вядомых пісьменнікаў розных перыядаў развіцця беларускай дзіцячай літаратуры); самастойнае выкананне заданняў (аналіз мастацкіх твораў, ідэі, задумы, характараў, моўных сродкаў і іншае); наяўнасць адзінкавых неістотных памылак. |
| 9 (дзевяць) | Поўнае, трывалае, глыбокае, сістэмнае веданне праграмнага вучэбнага матэрыялу; аперыраванне праграмным вучэбным матэрыялам у часткова змененай сітуацыі (прымяненне ведаў пры аналізе тэндэнцый развіцця беларускай дзіцячай літаратуры розных перыядаў, аналізе літаратурных твораў і асаблівасцей творчай манеры пісьменнікаў і іншае); наяўнасць дзеянняў і аперацый творчага характару для выканання заданняў па параўнальным аналізе творчасці асобных пісьменнікаў і іншае. |
| 10 (дзесяць) | Свабоднае аперыраванне праграмным вучэбным матэрыялам; прымяненне ведаў і ўменняў у незнаёмай сітуацыі (самастойныя дзеянні па апісанні, тлумачэнні асаблівасцей беларускай дзіцячай літаратуры ў розныя перыяды, творчасць найбольш вядомых пісьменнікаў сучаснасці, дэманстрацыя арыгінальных прыёмаў аналізу літаратурных твораў і іншае), выкананне творчых работ і заданняў, якія маюць даследчы характар (аналіз творчай манеры асобных пісьменнікаў розных перыядаў, параўнальны аналіз творчасці асобных пісьменнікаў і іншае). |